*Ю. В. КІРЧУК*

# ДЗЕЙНАСЦЬ МІСІІ ААН — ЮНРРА Ў ГАДЫ ПАСЛЯВАЕННАГА АДНАЎЛЕННЯ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ

Пытанні развіцця народнай гаспадаркі на заключным этапе вайны і ў пасляваенны перыяд недастаткова распрацаваны ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі. Многія з іх яшчэ застаюцца дыскусійнымі. Таму неабходна пашырыць кола выкарыстоўваемых крыніц, пераасэнсаваць з'явы грамадскага жыцця і сталыя тэндэнцыі. Вывучэнне вопыту аднаўлення прамысловасці ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасля яе заканчэння мае не толькі гісторыка-пазнавальнае значэнне, але актуальна і для сучаснай практыкі. Сёння на падставе рассакрэчаных дакументаў ёсць магчымасць прааналізаваць новыя факты, звязаныя з паступленнем міжнароднай эканамічнай і гуманітарнай дапамогі (па лініі ЮНРРА) у Беларусь, а таксама вызначыць іх ролю ў стварэнні прамысловага комплексу рэспублікі.

Упершыню ў беларускай гістарычнай літаратуры тэму «Беларусь і ЮНРРА» закрануў У. Е. Снапкоўкі ў сваёй манаграфіі «Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі 1944—1953 гг.» (Мінск, 1997) [12]. Аўтарам даследавана гісторыя заключэння і рэалізацыі дамовы паміж кіраўніцтвам БССР і ЮНРРА. Заўважым, што да цяперашняга часу работы У. Е. Снапкоўскага не страцілі сваёй актуальнасці і значнасці. Роля германскіх рэпарацый у аднаўленні гаспадарчага патэнцыялу рэспублікі раскрыта ў публікацыях Г. П. Бушчык [1, 2, 3]. На падставе шырокага кола крыніц, большая частка якіх была ўведзена ў навуковы ўжытак упершыню, даследчыца слушна падкрэслівае, што рэпарацыі паступалі ў БССР найперш у выглядзе прамысловага абсталявання, транспартных сродкаў. Найбольш інтэнсіўныя пастаўкі ажыццяўляліся ў 1945—1946 гг.

Вялікую дапамогу ў вывучэнні малавядомых пытанняў аднаўлення народнай гаспадаркі пасляваеннага перыяду аказваюць архіўныя дакументы, перш за ўсё матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Асабліва каштоўная інфармацыя знаходзіцца ў

---

**Кірчук Юлія Віктараўна —** аспірантка кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

---

фондзе 462 «Управление по поставкам ЮНРРА при Совете Министров БССР». Фонд змяшчае цікавую інфармацыю аб перапісцы дэлегацыі СССР, БССР з ЮНРРА, перапіску па тэхнічным стане абсталявання, справаздачы і звесткі аб паступленні і размеркаванні тавараў у БССР, справаздачы аб выкананні праграмы.

Праведзены аналіз літаратурнага і дакументальнага матэрыялу дазволіў аўтару зрабіць выснову, што ў 1945—1947 гг. міжнародная супольнасць аказвала беларускаму народу пэўную падтрымку ў аднаўленні народнай гаспадаркі Беларусі. Магчымасць выкарыстоўваць дапамогу ААН рэспубліка атрымала ўжо ў 1945 г. Размова ідзе пра аказанне дапамогі Беларусі па лініі ЮНРРА. Дадзенае даследаванне ставіць сваёй задачай ахарактарызаваць дзейнасць Місіі ААН — ЮНРРА па аказанні міжнароднай эканамічнай і гуманітарнай дапамогі для прамысловага аднаўлення Беларусі ў першыя пасляваенныя гады.

Дамову аб стварэнні ЮНРРА (UNRRA — United Nations Relief and Rehabilitation Administration) — Адміністрацыі Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па аказанні дапамогі і рэабілітацыі падпісалі 9 лістапада 1943 г. у Вашынгтоне прадстаўнікі 44 дзяржаў — удзельніц антыгітлераўскай кааліцыі: Вялікабрытаніі, Канады, Кітая, СССР, ЗША, Францыі і інш. Ад імя СССР пагадненне было падпісана савецкім паслом у ЗША А. А. Грамыкам. У жніўні 1945 г. у члены ЮНРРА былі прыняты БССР, УССР, Данія, у сакавіку 1946 г. — Турцыя.

ЮНРРА з’явілася першай буйной міжнароднай гуманітарнай арганізацыяй у вызваленым ад фашызму свеце. Мэта гэтай арганізацыі заключалася ў неадкладным задавальненні самых неабходных пасляваенных патрэб краіны, якія былі акупіраваны дзяржавамі фашысцкага блока, у харчаванні, вопратцы, медыкаментах, насенні, сельскагаспадарчым і прамысловым абсталяванні. Штаб-кватэра ЮНРРА знаходзілася ў Вашынгтоне, а Еўрапейскае рэгіянальнае бюро было створана ў Лондане. На чале ЮНРРА знаходзіўся Савет, які складаўся з прадстаўнікоў (або іх намеснікаў) ад кожнай краіны — удзельніцы ЮНРРА. Савет ЮНРРА павінен быў збірацца на сесіі не радзей двух разоў у год. Паміж сесіямі Савета палітычную лінію ЮНРРА вызначаў Цэнтральны камітэт ЮНРРА, які складаўся з прадстаўнікоў СССР, ЗША, Англіі і Кітая (пазней у яго былі дадаткова ўведзены прадстаўнікі Аўстраліі, Бразіліі, Канады, Францыі і Югаславіі). Рашэнні Цэнтральнага камітэта падлягалі зацвярджэнню Саветам.

Акрамя Савета і Цэнтральнага камітэта былі створаны два рэгіянальных камітэты: першы — па справах Еўропы і другі — па справах Далёка-

га Усходу. Былі таксама створаны камітэты: забеспячэння, фінансавага кантролю, прамысловага і сельскагаспадарчага аднаўлення, утрымання перамешчаных асоб, аховы здароўя і грамадскага апекавання.

Выканаўчая ўлада ЮНРРА ў межах агульнай палітыкі, вызначаная Саветам або Цэнтральным камітэтам, знаходзілася ў руках генеральнага дырэктара, які прызначаўся і звальняўся Саветам па аднагалоснай рэкамендацыі Цэнтральнага камітэта. Першым генеральным дырэктарам быў Герберт Ліман (з 1 студзеня 1944 г. па 31 сакавіка 1946 г.), былы губернатар Нью-Ёрка. Яго змяніў Фіорелло Генры Ла Гардзія (з 1 красавіка па 31 снежня 1946 г.), былы мэр Нью-Ёрка, пасля — генерал-маёр Лоуэлл Уорд Рукс (з 1 студзеня 1947 г. па 30 верасня 1948 г.).

Фонд дапамогі ЮНРРА складаўся з узносаў краін, тэрыторыя якіх не была акупіравана Германіяй, у памеры не менш за 1 % нацыянальнага даходу краіны за 1943 г. (рашэннем трэцяй сесіі Савета ЮНРРА гэта становішча было зменена: узнос у фонд ЮНРРА быў павялічаны да 2 % нацыянальнага прыбытку). Савецкі Саюз быў вызвалены ад выплаты ўзносаў. Усе астатнія краіны прызываліся Саветам ЮНРРА зрабіць свой уклад у справу дапамогі па меры магчымасці [14].

Савецкія прадстаўнікі ў Савеце ЮНРРА прыкладалі ўсе намаганні для таго, каб аказанне дапамогі краінам і размеркаванне яе сярод насельніцтва вызваленых тэрыторый было ў залежнасці ад патрэбнасці на справядлівых пачатках, без дыскрымінацыі па палітычных, рэлігійных або расавых прыкметах і каб дапамога ЮНРРА не выкарыстоўвалася ў якасці прылады ціску на насельніцтва.

Пры СНК БССР было створана Упраўленне па рэалізацыі дамовы з ЮНРРА. У сакавіку 1946 г. для размеркавання дапамогі ЮНРРА пастановай Савета Міністраў БССР было створана Упраўленне па пастаўках ЮНРРА пры Савеце Міністраў БССР. Праграма паставак выконвалася для БССР з канца 1945 г. па 31 сакавіка 1947 г.

Механізм паставак пачаў дзейнічаць пасля таго, як у сярэдзіне верасня 1945 г. ад прадстаўнікоў рэспублік былі атрыманы просьбы аб іх асноўных патрэбах. Пагадненні паміж ЮНРРА і ўрадамі БССР і УССР былі падпісаны ў Вашынгтоне 18 снежня 1945 г. Яны прадугледжвалі задавальненне заявак Беларусі да 30 чэрвеня 1946 г. на суму 61 млн дол. ЗША. Дамовы падпісаны Генеральным дырэктарам Г. Ліманам і І. І. Камінскім ад Беларускай ССР. Кароткае паведамленне ТАСС пра падпісанне пагадненняў было апублікавана ў пачатку студзеня 1946 г. [13].

Персанал беларускай місіі прыбыў у Мінск 19 красавіка 1946 г. і быў размешчаны ў загарадным доме ў раёне Лошыцкага парку. Супрацоўнікі

місіі ў пераважнай большасці з’яўляліся грамадзянамі ЗША [12, с. 64]. Місія ЮНРРА працавала ў Беларусі крыху больш за год (з красавіка 1946 г. па сакавік 1947 г.). У яе склад уваходзіла 15 чалавек. Узначальвалі місію на працягу гэтага часу грамадзяне ЗША Р. Скандрэт, Р. Фрэйз, Т. Уолер.

Тэадор Уолер спачатку быў намеснікам кіраўніка місіі ЮНРРА ў БССР. З 1947 г. — кіраўнік місіі. Яго жонка Рут Уолер працавала сакратаром місіі. Яна памерла 4 жніўня 1946 г. у Мінску, пахавана на вайсковых могілках.

Службовыя асобы Адміністрацыі ЗША і Еўрапейскай канторы аказалі выключнае садзеянне ў выкананні праграмы прамысловага аднаўлення ЮНРРА для Беларусі. Вядома работа Н. Р. Голда, В. Раднова, генеральнага дырэктара Рукса і яго намесніка Джаксона і інш. Яны аказвалі Місіі пастаянную і каштоўную дапамогу на ўсіх стадыях закупак, іх энергія і ўменне дапамаглі закупіць састаўныя часткі завода па вытворчасці пеніцыліну, трактары і насенне, пераадолець вялікія перашкоды ў закупцы праграмнага прамысловага абсталявання для Беларусі [8, с. 102—103]. Па заканчэнні дзейнасці Місіі былі зняты фільмы пра Беларусь «Марч оф Тайм» Пітэра Гопкінсона і каляровы фільм Джульена Брайна [6, с. 263].

Савецкае кіраўніцтва імкнулася не афішыраваць аказанне дапамогі Беларусі і Украіне з боку ААН. У адпаведнасці з пастановай СНК БССР ад 8 студзеня 1946 г. уся дакументацыя па аперацыях ЮНРРА афармлялася сакрэтна. Забаранялася работнікам у размовах і дакладах прыводзіць якія-небудзь лічбы па пастаўках ЮНРРА і спасылацца на пытанні дапамогі ЮНРРА [4, с. 23]. У беларускім друку пра дзейнасць ЮНРРА практычна нічога не публікавалася, за выключэннем паведамлення Т. Уолера для БелТА, надрукаванага ў «Звяздзе» і «Советской Белоруссии» [11]. Урад абмяжоўваўся публікацыяй рэдкіх афіцыйных матэрыялаў. 2 чэрвеня 1947 г. Т. Уолер даў газетнае інтэрв’ю некалькім англійскім і амерыканскім карэспандэнтам. Газетныя артыкулы, прадстаўленыя карэспандэнтамі, напісаныя на аснове гэтага інтэрв’ю, падвяргаліся строгай цэнзуры. З газетных артыкулаў агенцтва «Reuters» і «Associated Press» цэнзарам выкрэслівалася частка, дзе гаварылася аб тым, што прадукты ЮНРРА пераважаюць у крамах, што ЮНРРА адыграла значную ролю ў аднаўленні Беларусі і г. д. [8, с. 68].

Беларусь і Украіна разам з 8 еўрапейскімі краінамі адносіліся да групы А, якая карысталася абслугоўваннем у першую чаргу і атрымлівала тавары ў разліку больш чым долар на душу насельніцтва. У выніку БССР

атрымала тавараў у разліку 5,8 дол. на душу насельніцтва, УССР — 5,2 дол. Гэта самыя нізкія паказчыкі з групы А. Самыя высокія прыходзіліся на долю Грэцыі — 46,7 дол. на душу насельніцтва. Аб'ём дапамогі ЮНРРА, аказанай Беларусі і Украіне, быў найменшым сярод усіх еўрапейскіх краін-атрымальніц, за выключэннем Албаніі.

Міжнародныя пастаўкі для Беларусі па стане на 31 жніўня 1947 г. уключалі прадукты харчавання (29 789 044 дол.), адзенне (7 051 267 дол.), медзабеспячэнне (953 031 дол.), абсталяванне для аднаўлення сельскай гаспадаркі (5 599 379 дол.), прамысловасці (17 691 570 дол.) і г. д. [9, с. 2]. Памер дапамогі, якую атрымала БССР, склаў 2,6 % паставак ЮНРРА для Еўропы ў доларах і 0,9 % — у тонах [12 , с. 68].

Значная ўвага надавалася праграме прамысловага аднаўлення, бюджэт якой складаў 17 548 040 дол. ЗША [9, с. 29]. Усяго ў ЗША і Канаду паставілі абсталявання на суму 8 715 427 дол., у Англію і Францыю — на 9 257 173 дол. [9, с. 30—40]. Амаль палову дадзенай праграмы складалі так званыя «пратакольныя тавары» [12, с. 70]. Гэта былі электрастанцыі, пастаўленыя з Англіі. Другой вялікай групай тавараў былі лішкі тэхнікі войска ЗША, якія засталіся пасля вайны ў Еўропе.

У сувязі з разбурэннем гарадскіх электрасетак, газа- і водазабеспячэння, жыллёвага фонду, заводаў і фабрык адміністрацыя зрабіла ўпор на пастаўку абсталявання для грамадскай інфраструктуры і камунікацый, на стымуляванне тарфяной і будаўнічай прамысловасці, вытворчасці канструкцыйных матэрыялаў.

Праграма прамысловага аднаўлення ўключала пастаўкі абсталявання харчовай прамысловасці (фірм «Блисс», «Клермонт»); будаўнічага, дрэваапрацоўчага і энергетычнага абсталявання (фірм «Т. Уайт», «Де вольт», «Соус Велс»); транспарту (фірм «Макк», «ДМС», «Плимут»); металаапрацоўчых станкоў (фірм «Цинцинати», «Гиддинг и Льюис», «Ван Норман», «Хильд») і г. д. Прыбывалі састаўныя часткі заводаў керамічных блокаў і чарапіцы фірм «Риддел» і «Боннот», абсталяванне заводаў мінеральнай шэрсці, пеніцылінавага, пратэзнага, асфальтавага — фірмы «Аллегени», завода малочных фляг, устаноўкі для вырабу шклатары — фірмы «Амслер Мортан» і г. д. [5, с. 291—307].

Дзякуючы дапамозе ў Мінску быў адкрыты пеніцылінавы завод (у цяперашні час — ААТ «Белмедпрэпараты»), абсталяванне для якога пачало паступаць у пачатку 1946 г., а ў Канаду былі накіраваны беларускія спецыялісты для вывучэння тэхналогіі яго вытворчасці.

Адміністрацыя ЮНРРА ўключала ў агульны план паставак прамыслова абсталявання для ўсіх атрымліваючых прымусовы асартымент,

які не ўваходзіў у агульную суму паставак. Для Беларусі ён складаў каля 2000 тон [5, с. 160—163]. Запасныя часткі, абяцаныя Місіяй ЮНРРА для рамонту абсталявання, паступалі ў БССР з дзвюх крыніц. Першая — непасрэдна са ЗША. У асноўным гэта карабельна-пагрузачнае абсталяванне. Другая — са складоў ЮНРРА ў Англіі, да якой адносілася больш тысячы тон запасных частак станочных і будаўнічых матэрыялаў. Запасныя часткі, адгружаныя з Англіі навалам, без сістэмы, уяўлялі сабой галоўным чынам матэрыялы (бронзавыя загатоўкі, электроды, балты, гайкі і г. д.) і фактычна не маглі быць выкарыстаны [10 , с. 18].

Не заўсёды пастаўкі ЮНРРА выконваліся ў адпаведнасці з заключанымі дамовамі. Абсталяванне паступала ў разукамплектаваным стане, са спазненнем, а тэхнічная дакументацыя — без перакладу [7, с. 302]. Інфармацыя аб адгрузках абсталявання на параходах у асноўным абмяжоўвалася толькі паведамленнем аб танажы. У сувязі з гэтым ускладнялася папярэдняе размеркаванне абсталявання, якое прыбывае. Кошт прамысловых паставак у многіх выпадках быў невядомы [5, с. 7—8]. Абсталяванне не магло быць эфектыўна выкарыстана з прычыны разукамплектаванасці і адсутнасці запасных частак для рамонту [7, с. 15].

Працяг дзейнасці ЮНРРА не ўваходзіў у разлік кіруючых колаў ЗША, якія неслі асноўны цяжар па аказанні дапамогі краінам, якія пацярпелі ад вайны. На 5-й сесіі Савета ЮНРРА ў жніўні 1946 г. прадстаўнік ЗША У. Клейтан прапанаваў ліквідаваць гэту арганізацыю, заявіўшы, што яе асноўныя мэты выкананы. ЮНРРА спыніла сваю дзейнасць у Еўропе 30 чэрвеня 1947 г. 1 ліпеня 1947 г. замест ЮНРРА была створана ІРО (International Refugee Organisation) — Міжнародная арганізацыя па справах бежанцаў і перамешчаных асоб, у якой СССР не ўдзельнічала. Адміністрацыя працягвала працаваць у асноўным у Кітаі да 31 сакавіка 1949 г. Затым функцыі ЮНРРА былі перададзены іншым ўстановам сістэмы ААН, першым чынам Упраўленню Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў, Сусветнай харчовай праграме і Дзіцячаму фонду ААН.

Дапамога, якая паступала ў 1946—1947 гг. у Беларусь па лініі ЮНРРА, нягледзячы на абмежаваны характар, недастатковы аб'ём, адыграла важную ролю ў забеспячэнні першапачатковых патрэб насельніцтва, у аднаўленні некаторых галін прамысловасці, у пераадоленні пасляваеннай разрухі сельскай гаспадаркі, у рамонце камунікацый і сувязі, будаўніцтве. Дапамога ўраду і народу Беларусі спрыяла наладжванню дружалюбных адносін беларусаў з народамі іншых краін, была ўвасабленнем салідарнасці і падтрымкі з боку міжнароднай супольнасці да нацыі, якая ўне-

сла прызнаны ўклад у барацьбу з фашызмам і панесла велізарныя страты ў Другой сусветнай вайне.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Бушчык, Г. П.* Знешнеэканамічная дзейнасць у гаспадарчым развіцці Беларусі: гістарычны аспект / Г. П. Бушчык // Власть и жизнь. Междунар. науч. конф. «Политический и социально-экономический процесс в Беларуси: состояние, проблемы, перспективы», 11—12 дек., 1997 г. Редкол. : В. А. Бобков [и др.]. Минск, 1998. 346 с.

2. *Бушчык, Г. П.* Міжнародныя пагадненні аб рэпарацыях і іх паступленне ў БССР у 1945—1946 гг. / Г. П. Бушчык // Беларускі гістарычны часопіс. 2005. № 6.

3. *Бущик, Г. П.* Роль германских репараций в формировании современного промышленного облика Минска / Г. П. Бущик // Устойчивое развитие современных крупных городов: теория, опыт, проблемы: материалы Междунар. науч.-практ. конф., состоявшейся 23—24 мая 2002 г., Минск / НИИ социально-экономических и политических проблем. Минск, 2002. 371 с.

4. НАРБ. Ф. 462. Управление по поставкам ЮНРРА при Совете Министров БССР. Воп. 4. Спр. 9. Штатные расписания и переписка с организациями Белорусской ССР по товарам ЮНРРА.

5. НАРБ. Ф. 462. Управление по поставкам ЮНРРА при Совете Министров БССР. Воп. 4. Спр. 44. Переписка по техническому и другому оборудованию с организациями и предприятиями БССР и СССР.

6. НАРБ. Ф. 462. Управление по поставкам ЮНРРА при Совете Министров БССР. Воп. 5. Спр. 33. Отчеты о выполнении Программы по Белоруссии о содержании Миссии за апрель — май. Список распределения оборудования и докладная записка. Акт о получении электромагнитных зерноочистительных установок. Об отгрузке товаров в БССР пароходами и другая переписка с Миссией ЮНРРА в БССР по поставкам продовольствия, промтоваров и оборудования в БССР.

7. НАРБ. Ф. 462. Управление по поставкам ЮНРРА при Совете Министров БССР. Воп. 5. Спр. 35. Составление окончательного отчета о завершении Миссии и дополнительных соглашениях об отправке товаров в БССР пароходами оборудования для пенициллинового завода. Количество и использование доходов от продажи товаров ЮНРРА. Отчет о содержании Миссии за март, расписки, сводка отчета о завершении программы и другая переписка с Миссией ЮНРРА в БССР по поставкам продовольствия, промтоваров и оборудования в БССР.

8. НАРБ. Ф. 462. Управление по поставкам ЮНРРА при Совете Министров БССР. Воп. 5. Спр. 37. Совещание о пенициллине. Цензура газетных статей о ЮНРРА. Поездки Миссии. Благодарность Правительству БССР за украшение могилы госпожи Уоллер. Газетные вырезки о посещении г. Москва Ла Гардиа. Отчеты об использовании доходов от реализации товаров ЮНРРА в БССР по поставкам и реализация продовольствия, промтоваров и оборудования в БССР.

9. НАРБ. Фонд 462. Управление по поставкам ЮНРРА при Совете Министров БССР. Воп. 5. Спр. 40.Справка о выполнении программы снабжения БССР товарами ЮНРРА по состоянию на 31 августа 1947 г.

10. НАРБ. Ф. 462. Управление по поставкам ЮНРРА при Совете Министров БССР. Воп. 6. Спр. 9. Документы (справки, копии актов) по предъявленной претензии к Администрации ЮНРРА.

11. *Пышкин, П.* Поставки ЮНРРА для Белоруссии / П. Пышкин // Советская Белоруссия. 1947. 18 февр.

12. *Снапкоўскі, У. Е.* Беларусь і ЮНРРА / У. Е Снапкоўскі // Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі 1944—1953 гг.; пад рэд. Ю. П. Броўкі / Акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. Мінск : Беларус. навука, 1997. 207 с.

13. Сообщение о соглашениях между ЮНРРА и правительствами Украинской ССР и Белорусской ССР // Советская Белоруссия. 1946. 3 янв.

14. ЮНРРА // Словари и энциклопедии на Академике [Электронный ресурс]. — 2010. — Режим доступа: http://dic.academic.ru/dic.nsf/dic_diplomatic/1359/ЮНРРА. — Дата доступа: 07.10.2010.

## РЭЗЮМЭ. SUMMARY

В статье определяется роль международной экономической и гуманитарной помощи (по линии ЮНРРА) для промышленного восстановления Беларуси в первые послевоенные годы. Отмечается, что значительное содействие в выполнении программы ЮНРРА для Беларуси оказали США. Подчеркивается отсутствие информации для населения о программах помощи ЮНРРА, засекречивание партийно-государственными органами информации о поставках ЮНРРА. Значительное внимание уделяется исследованию программы промышленного восстановления Беларуси.

The article deals with the role of international economic and humanitarian help (in the area of UNRRA) for an industrial reconstruction of Belarus in the first post-war years. It is noticed, that the USA has rendered an exclusive assistance in performance of UNRRA program for Belarus. Absence of the information for the population about programs of UNRRA help and its secrecy by the party-state bodies of the information on deliveries UNRRA is underlined. The considerable attention is given to research of the program of an industrial reconstruction of Belarus.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 12 студзеня 2011 г.